Языковое сознание рассматривается как один из видов сознания, является механизмом управления речевой деятельностью, которая формирует, хранит и превращает языковые знаки, правила их сочетания и употребления [4]. Языковое сознание является обязательным условием для существования и развития всех других форм сознания. Специфика феномена языкового сознания проявляется через конкретные проявления, в процессе функционирования, что делает необходимым детальный анализ различных функций языкового сознания (отображающей, оценочной, ориентировочно-селективной, интерпретативной, регулятивно-управляющей).

**Заключение.** Развитие языкового сознания в дошкольном возрасте имеет достаточное теоретическое обоснование и является необходимым условием формирования языково-речевой личности ребёнка в канун его поступления в школу и продолжения дальнейшего языкового образования.

**Список цитируемых источников**


1. *Выготский, Л. С.* Исследование развития научных понятий в детском возрасте / Л. С. Выготский // Собр. соч. : в 6 т. — М. : Педагогика, 1982. — Т. 2. — С. 184—294.
2. *Выготский, Л. С.* Экспериментальное исследование развития понятий / Л. С. Выготский // Собр. соч. : в 6 т. — М. : Педагогика, 1982. — Т. 2. — С. 23—80.
3. *Гальперин, П. Я.* Языковое сознание и некоторые вопросы взаимоотношения языка и мышления / П. Я. Гальперин // Вопр. философии. — 1977. — № 4. — С. 95—101.
4. *Ейгер, Г. В.* Образ языка и образ биологического вида с позиций общей теории развивающихся систем и теории уровней научного знания / Г. В. Ейгер, В. М. Эпштейн // Вісн. Харків. нац.ун-ту імені В. Н. Каразіна. Сер. Романо-германська філологія. Методика викладання іноземних мов. — Харків, 2015. — № 1155, вип. 80. — С. 6—11.
5. *Залевская, А. А.* Языковое сознание и описательная модель языка / А. А. Залевская // Методология современной лингвистики : сб. ст. — М. ; Барнаул : Изд-во Алт. ун-та, 2003.
6. *Калмыкова, Л. О.* Речеязыковая рефлексия как проявление интеллектуального развития дошкольников / Л. О. Калмыкова // Дошкольное образование: наука — практике : сб. науч. ст. Междунар. науч.-практ. конф. / под ред. О. О. Прокофьевой, Е. А. Мурашко. — Могилёв : МГПУ им. А. А. Кулешова, 2015. — С. 169—172.
7. *Кашкин, В. Б.* Язык, коммуникация и социальная среда / В. Б. Кашкин. — Воронеж : ВГУ, 2007. — С. 117—136.
8. *Леонтьев, А. А.* Язык и речевая деятельность в общей и педагогической психологии / А. А. Леонтьев. — Воронеж : МОДЭК, 2001. — 446 с.
9. *Леонтьев, А. Н.* Психологические вопросы сознательности учения / А. Н. Леонтьев // Вопросы психологии понимания. — М. : АПН РСФСР, 1947. — Вып. 7. — С. 32—44.
10. *Селігей, П. О.* Структура й типологія мовної свідомості / П. О. Селігей // Мовознавство. — 2009. — № 5.
11. *Уланович, О. И.* Языковое сознание: особенности структуры в условиях двуязычия / О. И. Уланович // Вестн. Том. гос. ун-та. Филология. — 2010. — № 1. — С. 44—51.
12. *Цейтлин, С. Н.* Язык и ребёнок: лингвистика детской речи / С. Н. Цейтлин. — М. : Владос, 2000. — 239 с.
13. *Яворська, Г. М.* Прескриптивна лінгвістика як дискурс: мова, культура, влада / Г. М. Яворська. — Київ, 2000. — С. 145.


УДК 378

**В. М. Дрозд**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Жамчужненскі яслі-сад», аг. Жамчужны*

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЦАЦКА — ЦАЦКА ДЛЯ СУЧАСНЫХ ДЗЯЦЕЙ

**Уводзіны.** Народная цацка — старажытнейшы від народнага мастацтва. У ім сабраны вопыт многіх пакаленняў, увасоблены спрадвечныя жыццёвыя каштоўнасці народа. Народная цацка з'яўляецца захавальнікам памяці народа, транслятарам яго гістарычных, культурных традыцый. Яна, як і народная казка, народная песня, народная гульня, уплывае на патрыятычнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту, фарміраванне іх нацыянальнай самасвядомасці. Яна развівае іх цікавасць да традыцый свайго народа, да гісторыі яго жыцця. Выкананая з пяшчотай і любоўю, цацка развівае фантазію, духоўны свет выхаванцаў. Беларускія народныя цацкі маюць нацыянальную адметнасць, свае педагагічныя і мастацкія традыцыі. Для народнай цацкі беларусаў характэрна яе сціплая расфарбоўка, прастата выканання, выразнасць вобразаў [1].

**Асноўная частка.** У нашай дашкольнай установе народная цацка прысутнічае ў адных групах у беларускім куточку, у другіх — у беларускай хатцы. Ужыванне народнай цацкі разам з аваладаннем роднай мовай, фальклорнымі творамі фарміруе ў дзяцей той духоўны ўклад, які спатрэбіцца ў далейшым жыцці. Пры знаёмстве з казкамі, паданнямі выхаванцы сустракаюцца з міфічнымі персанажамі. Часам дзеці просяць патлумачыць імя таго ці іншага персанажа, расказаць пра іх выгляд, звычкі, характар. Мы вырашылі вырабіць беларускія нацыянальныя цацкі з тканіны, каб выхаванцы змаглі патрымаць гэтыя цацкі ў руках, лепш запомніць іх вобразы. Знаёмства выхаванцаў з цацкамі ажыццяўляем на занятках «Дзіця і грамадства», «Маляванне», «Аплікацыя», «Лепка», у вольны час.

© Дрозд В. М., 2019

Репозиторий БарГУ

З тканіны мы вырабілі наступныя беларускія нацыянальныя цацкі.

КУРАЧКА — цацка ўвасабляе сабой сілу зямлі і ўрадлівасць. Знаёмства з курачкай пачынаецца праз забаўлянку «А курачка-рабушачка», «Курачка мая», «На улице три курицы». Характар курачкі пазнаецца ў народных казках «Пшанічны каласок», «Курачка рабка», «Як курачка пеўніка ратавала», «Каласок».

КАЗА — свойская жывёла, якая сімвалізуе дабрабыт і ўрадлівасць. Знаёмства з казой пачынаецца праз забаўлянкі «Ідзе каза рагатая», «Ты, каза, каза, лубяныя вочы», «Пайшоў казёл у арэхі», «Дзе каза рогам», «Наш козёл-стрекозёл то-то умный был», «Привяжу я козлика», народныя казкі «Каза-манюка», «Лиса и козёл».

КОТ — свойская жывёла, верная свайму гаспадару. Коцік цесна звязаны з хатнім духам. У новую хату першым запускалі ката. Знаёмства пачынаецца з забаўлянак «А ты, коцінька-каток», «А ты, каток шэры», «Ходзіць коцік па палях». Характэрныя рысы вызначаюцца ў народных казках «Каток — залаты лабок», «Коцік, пеўнік і лісіца» і ў аўтарскіх вершах В. Віткі «Коця і Каця», І. Муравейкі «Адмарозіў лапкі», Н. Галіноўскай «Коцік-варкоцік».

БАРАН-КРУТАРАГАН — сімвалізуе багацце, жыццёвы поспех. У яго крутыя накручаныя рогі. Казка «Баран — бок абадран». Развучваецца гульня «Пастушок і авечкі», у якой дзяўчаты — авечкі, хлопчыкі — баранчыкі.

КОНІК — гэта свойская жывёла. Конь вельмі станоўча апісваецца ў прыказках, казках, песнях, бо быў неабходны селяніну і ваяру. Знаёмяцца дзеці з конікам праз забаўлянку «Кую-кую ножку», народныя казкі «Лёгкі хлеб», «Пра быка і яго сяброў», верш З. Бядулі «Гэй, мой конік», М. Чарняўскага «Конік».

МЯДЗВЕДЗЬ — лясная жывёла. Знаёмства з жывёлай адбываецца ў забаўлянках «Сядзіць мядзведзь на калодзе», «У куце сядзіць мядзведзь», а затым праз беларускія народныя казкі «Пра быка і яго сяброў», «Як кот звяроў напалохаў», «Селянін, мядзведзь і лісіца», «Дзедава рукавічка».

КАЧКА — свойская або дзікая птушка. Яе вобраз прысутнічае ў забаўлянках. З маленства дзяцей вучаць агучваць голас качкі. Верш Р. Барадуліна «Шукалі качаня» паказвае, што качка сябруе з вадой, паветрам і зямлёй.

ПЕЎНІК — гэта свойская птушка, сімвал шчасця, урадлівасці, захавальнік хатняга дабрабыту. Характэрныя рысы пеўніка вызначаны ў загадцы «Не кароль, а ў кароне, не гусар, а пры шпорах, гадзінніка не мае, а час знае». Знаёмства з пеўнікам пачынаецца з калыханак і забаўлянак «Ходзіць певень па капусце», «Ку-ка-рэ-ку, певунок» і народных казак: «Зайкава хатка», «Як курачка пеўніка ратавала», «Коцік, пеўнік і лісіца».

У беларускай народнай міфалогіі прысутнічаюць казачныя героі. З імі выхаванцаў знаёмяць падчас правядзення народных святаў. Яны выглядаюць, як лялькі ў адпаведным выглядзе і адзенні.

ОХ — міфічны персанаж, у выглядзе невысокага барадатага мужычка, які жыве пад зямлёю. Ён носіць паласатыя штаны, кашулю і пояс з беларускім арнаментам, на нагах — лапці, на галаве — саламяны капялюшык. У час расказвання казкі «Ох і залатая табакерка» выхаванцы разглядаюць цацку, яе характэрныя асаблівасці. Дзеці адчуваюць маляўнічасць казачных вобразаў.

ВАДЗЯНІК у Беларусі — уладар вадаёмаў. Яго ўяўлялі ў абліччы старога мужчыны з доўгімі валасамі зялёнага колеру, увесь ён у ціне і водарасцях. Ён можа жыць у любым вадаёме, а таксама ў калодзежы. Дзяцей знаёмяць з вобразам і яго характэрнымі асаблівасцямі.

ХАТНІК (ДАМАВІК) — надзяляецца ўсімі якасцямі дбайнага гаспадара. Калі справы ў сям'і ідуць добра і добрае прадбачыцца ў будучыні, ён скача на лаве ў хаце ці ў сенцах. З дамавіком неабходна жыць у згодзе і ўмець яму дагаджаць. У дамавіка вобраз старога дзеда з белай барадой і доўгімі валасамі. Адзенне простае: белая кашуля з арнаментам, на галаве — магерка, на нагах — лапці. Выхаванцаў знаёмяць з вобразам і яго характэрнымі асаблівасцямі.

ПАЛЯВІК — гэта малады дужы хлопец з русымі валасамі. Ён — міфічная істота. З яго дапамогай ажыццяўляецца сельскагаспадарчая праца на палях: махне палявік правай рукою — расце і таўсцее сцябло, махне левай — наліваецца колас, а страсяне галавою — уся ніва ўсцілаецца залатымі снапамі. На занятку выхаванцаў знаёмяць з казкай «Палешукі і палевікі».

ЯРЫЛА — малады юнак, міфічная істота. Апрануты ў белы плашч, на галаве — вянок, ногі босыя, у руках каласы. Дзяцей знаёмяць з вобразам і яго характэрнымі асаблівасцямі.

АСІЛАК — гэта міфічны і казачны герой. Ён выглядае магутным чалавекам у адзенні са звярыных шкур. Знаёмяць дзяцей з асілкам у час расказвання беларускай народнай казкі «Асілкі». Выхаванцы эмацыйна ўспрымаюць казку, разумеюць змест казачнага тэксту, адчуваюць маляўнічнасць казачных вобразаў.

КАЦІГАРОШАК — казачны герой. Гэта маленькі хлопчык з круглай галавой, падобнай на гарошынку, з чубчыкам, нібы завіток гароху. Тулава таксама круглае. З ім знаёмяць выхаванцаў праз казку «Пакацігарошак».

ЛЯСУН — міфічная істота, гаспадар лесу і звяроў. Галава падобная на вершалінку хвоі, тулава апранута ў звярыныя шкуры, рукі і ногі моцныя, як ствалы дубоў, а вочы гарац, як у савы. Рост яго залежыць ад памеру тых дрэў у лесе, дзе ён знаходзіцца, і адпавядае ім. Каб ніхто не мог дабрацца да яго логава, валіць на зямлю мноства дрэў. Яго заўсёды суправаджаюць звяры і птушкі. Ён дапамагае людзям шукаць лепшыя мясціны для палявання, грыбныя і ягадныя мясціны. Можа пажартаваць і прымусіць чалавека паблукаць па лесе. Выхаванцаў знаёмяць з вобразам і яго характэрнымі асаблівасцямі.



Рэпазіторый БарДУ

ЗЮЗЯ — бог зімы. Яго яшчэ называюць беларускім Дзедам Марозам. Выглядае як маленькі дзядок, тоўсты, з белымі валасамі і белай барадой. Ходзіць у цёплай вопратцы, а ногі босыя. У руцэ — чыгунная булава. На занятку па азнаямленні з Зюзяй вывучаецца верш Л. Геніюш «Мароз». Таксама можна пазнаёміць з вершамі Я. Журбы «Дзед Мароз», Я. Коласа «Дзед-госць». Выхавацель у час занятку паказвае выхаванцам цацку Зюзя, дзеці разглядаюць яе і абмяркоўваюць паводзіны персанажу.

ЛЯЛЯ — міфічны персанаж, багіня вясны. Гэта стройная прыгожая дзяўчынка, у якой на галаве вяночак з кветак. Яна аберагае закаханых.Дзяцей знаёмяць з вобразам і яго характэрнымі асаблівасцямі [2].

**Заключэнне.** У час гульні з народнай цацкай развіваецца родная мова, фарміруецца устойлівая цікавасць да яе, фальклору, ствараецца сітуацыя асобасна арыентаванага ўзаемадзеяння цацкі з кожным дзіцем.

Мы прапануем такую схему аналізу цацкі: вызначэнне матэрыялу, з якога зроблена цацка; асноўнага (фонавага) колеру; асноўных элементаў; кампазіцыі ўзору; характару колеравага выканання.

У працэсе інсцэніроўкі асобных урыўкаў казкі развіваюцца навыкі дыялагічнага маўлення, падтрымліваецца жаданне падаць голас так, як гэта робяць жывёлы. Працягваецца знаёмства дзяцей з беларускім нацыянальным адзеннем; вылучаюцца характэрныя асаблівасці беларускага арнаменту; замацоўваецца веданне геаметрычнага і расліннага арнаментаў; звяртаецца ўвага на характэрныя асаблівасці беларускага нацыянальнага касцюма: перавага белага колеру, элементы дэкору (колер, форма); фарміруецца ўяўленне аб тым, што вышыўка выкарыстоўваецца для ўпрыгожвання адзення; развіваецца эстэтычны густ.

### Спіс цытаваных крыніц


1. *Пралыгіна, Н. В.* Гульні з лялькай: фарміраванне сацыяльнага вопыту і асабістых якасцей у дзяцей 3-га года жыцця сродкамі вуснай народнай творчасці ў гульнявой дзейнасці / Н. В. Пралыгіна. — Минск : Новое знание, 2015. — 40 с.
2. *Старжынская, Н. С.* Народная цацка — люстэрка культуры : дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з беларус. і рус. мовай навучання : з электрон. дадаткам / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. — Мінск : Выш. шк., 2014. — 87 с.



УДК 378



**Д. І. Жыдаль**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Жамчужненскі яслі-сад», аг. Жамчужны*


## БІЛІНГВІЗМ

**Уводзіны.** Білінгвізм (лац. bilinguis < (bis) двойчы, lingua мова), ці двухмоўе, — валоданне і папераменнае карыстанне дзвюма мовамі. Калі ва ўжытку знаходзяцца тры і больш моў — гэта шматмоўе, або полілінгвізм. У навуковай літаратуры можна знайсці і некаторыя іншыя азначэнні гэтага паняцця. І гэта зразумела, бо білінгвізм — гэта вельмі складаны моўны і маўленчы працэс. Так, Ю. Д. Дэшырэеў вызначае двухмоўе як «вольнае валоданне ці проста валоданне дзвюма мовамі» [5]. На думку даследчыка, двухмоўе пачынаецца тады, калі ступень авалодання другой мовай шчыльна набліжаецца да ступені валодання першай. У. Вайнрайх лічыць, што білінгвізм — гэта папераменнае карыстанне дзвюма мовамі ў залежнасці ад сітуацыі, а асоб, якія ў той ці іншай ступені валодаюць дзвюма мовамі, называе білінгвамі [3].

На нашай планеце жывуць многія народы. Яны знаходзяцца ў пастаянным кантакце адзін з адным, асабліва суседнія этнасы, якія часта маюць адну тэрыторыю пражывання або знаходзяцца ў складзе адной дзяржавы. Моўныя кантакты, якія дыктуюцца эканамічнымі, культурнымі і іншымі сувязямі, патрабуюць вывучэння і выкарыстання ў моўнай практыцы дзвюх і больш моў. Існуюць і іншыя матывы авалодвання дзвюма ці некалькімі мовамі (атрыманне адукацыі, патрэбы навуковай дзейнасці і інш.).

Адным з рэгіёнаў, значная частка насельніцтва якога карыстаецца дзвюма мовамі, з’яўляецца Беларусь. На тэрыторыі Беларусі двухмоўе існавала даўно, хоць яго характар і састаўныя кампаненты мяняліся. Ужо ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага існавала беларуска-царкоўнаславянскае пісьмовае і вуснае двухмоўе. З пашырэннем на тэрыторыі Беларусі польскай мовы пачало складвацца беларуска-польскае двухмоўе. Пазней, калі пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі адышлі да Расіі і функцыі афіцыйнай мовы ў значнай ступені стала выконваць руская мова, шырока развіваецца беларуска-рускае двухмоўе. У раёнах сумеснага пражывання беларусаў з іншымі народамі фарміравалася беларуска-літоўскае, беларуска-ўкраінскае, беларуска-латышскае двухмоўе. У перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, а таксама ў апошні час характар і развіццё двухмоўя і ў цэлым моўная сітуацыя на Беларусі ў значнай ступені залежалі ад дзяржаўнай палітыкі (паланізацыя, русіфікацыя і інш.).


© Жыдаль Д. І., 2019



Репозиторий БарГУ